Цана 10 кап. (грош.)

Пралетарыі ўсіх краін, яднайцеся!

Орган Часовага Упраўлення гор. Вільно

ВІЛЕНСКАЯ ПРАЎДА

№ 14
7 кастрычніка 1939 г.
Субота

У дружнай сям'і народаў Совецкага Саюза будаваць сваё радаснае і шчаслівае жыццё — гарачае жаданне працоўных Заходняй Беларусі. Няхай жыве Саюз Совецкіх Соцыялістычных Рэспублік!

Дастойна сустрэнем Народнае Сабранне!

Учора ў нашай газеце быў апублікован зварот Часовага Упраўлення горада Беластока да ўсіх Часовых Упраўленняў гарадоў Заходняй Беларусі з прапановай аб скліканні Народнага Сабрання, якое скажа сваё слова аб дзяржаўным устройстве, аб стварэнні на тэрыторыі Заходняй Беларусі ўлады. Гэты зварот знайшоў жывейшы водгук і адабрэнне ў шырокіх масах працоўных свабоднай Заходняй Беларусі.

Непераможная Рабоча-Сялянская Чырвоная Армія з чэсцю выканала свой інтэрнацыянальны доўг перад любімай радзімай соцыялізма і вызваліла Заходнюю Беларусь ад пакут і рабства, прынёсшы працоўным свабоду і шчасце. Там, дзе нядаўна панаваў голад і жабрацтва, соцыяльны праізвол і нячуваны прыгнёт, дзе брацкі беларускі народ стагнаў пад ігам польскай шляхты і быў самы бяспраўны і абяздолены, зараз развяваецца чырвоны сцяг свабоды, міра і радаснага жыцця.

З дапамогай Чырвонай Арміі працоўныя Заходняй Беларусі скінулі ярмо рабства і бязлітаснай эксплаатацыі. Па вёсках не рыскаюць больш паліцэйскія, не свішчуць панскія бізуны па сялянскіх спінах. Гэтаму панскаму прыгнёту і здзекам не бываць ніколі ў беларускіх вёсках.

На ўсіх прадпрыемствах і ў установах горада прайшлі ўчора многалюдныя мітынгі, прысвечаныя абмеркаванню зварота Часовага Упраўлення горада Беластока. На мітынгах і сходах працоўныя выказваюць сваё аднадушнае жаданне з'яднацца ў брацкую сям'ю народаў Совецкага Саюза, далучыцца да Совецкай Соцыялістычнай Беларусі. У сваіх выступленнях на мітынгах і сабраннях рабочыя і інтэлігенцыя славяць доблесную Чырвоную Армію, выказваюць бязмежную ўдзячнасць совецкаму народу і таварышу Сталіну.

— Мы вітаем гераічную Чырвоную Армію і вялікі совецкі народ, за аказаную нам брацкую дапамогу ў вызваленні ад іга польскіх паноў, — гаворыць тав. Бонька, рабочы электрастанцыі. Адзіным нашым жаданнем з'яўляецца — з'яднацца з свабоднай Совецкай Соцыялістычнай Беларусіяй і жыць у дружнай сям'е народаў СССР, пад яркім сонцам Сталінскай Канстытуцыі. Усе мы аднадушна галасуем за совецкую ўладу, уладу рабочых і сялян у Заходняй Беларусі.

— Наша заветная мара — жыць і работаць пад сонцам Сталінскай Канстытуцыі. Мы хочам жыць мірна і жадаем, каб нашу мірную работу і жыццё абараняла такая магутная, пакрыўшая сябе славай у барацьбе за справу народа, Рабоча-Сялянская Чырвоная Армія. Такі голас ідзе ад мільёнаў сэрцаў працоўных усёй свабоднай Заходняй Беларусі.

Усе працоўныя масы Заходняй Беларусі цвёрда вераць, што толькі Чырвоная Армія здольна абараніць іх жыццё і мірную працу. У гэтым яны пераканаліся ўжо за апошнія дні.

Настаў час для народаў свабоднай Заходняй Беларусі апраздзяліць уладу. Сказаць сваё слова аб дзяржаўным устройстве. Няма сумнення, што выбраннікі ў Народнае Сабранне выразяць думкі і пачуцці ўсяго народа і аднадушна рашаць аб стварэнні ў Заходняй Беларусі совецкай улады. Такі наказ дадуць народы свабоднай і шчаслівай Беларусі.

Рабочыя, сяляне і інтэлігенцыя будуць выбіраць у Народнае Сабранне Заходняй Беларусі самых верных і адданых сыноў і дочак народа. Яны пашлюць туды тых, хто поўнасцю выразіць іх спрадвечныя мары аб свабодным і радасным жыцці, аб далучэнні Заходняй Беларусі да Совецкай Соцыялістычнай Беларусі, да Саюза Совецкіх Соцыялістычных Рэспублік.

Наша заветная мара — з'яднацца з БССР, каб жыць у сям'і Совецкага народа

У канцы рабочага дня рабочыя, тэхнікі, інжынеры і служачыя гарадской электрастанцыі спяшылі ў клуб. Тут адбыўся мітынг калектыва работнікаў электрастанцыі, прысвечаны абгаварэнню зварота Часовага Упраўлення гор. Беластока да ўсіх Часовых Упраўленняў гарадоў Заходняй Беларусі.

Уважліва быў заслухан Зварот.

Прадстаўнік Часовага Упраўлення тав. Чычэра падрабязна расказаў сабраўшымся аб вялікіх гістарычных падзеях, аб энтузіязме і гераізме Рабоча-Сялянскай Чырвонай Арміі, якая вызваліла працоўных Заходняй Беларусі ад гнёту польскіх паноў.

Доўга незмаўкаючыя апладысменты і прывітальные воклічы нясуцца ў чэсць Чырвонай Арміі, у чэсць вялікага таварыша Сталіна.

Затым разгарнуліся спрэчкі. Выступаўшыя рабочыя гаварылі аб сваім аднадушным жаданні хутчэй з'яднацца з Совецкай Соцыялістычнай Беларусіяй, з вялікай дружнай сям'ёй совецкага народа.

Слова атрымаў рабочы тав. Бонька:

— Мы вітаем гераічную Чырвоную Армію і вялікі совецкі народ, за аказаную нам брацкую дапамогу ў вызваленні ад іга польскіх паноў, — гаворыць тав. Бонька. Адзіным нашым жаданнем з'яўляецца — з'яднацца з свабоднай Совецкай Соцыялістычнай Беларусіяй і жыць у дружнай сям'е народаў СССР, пад яркім сонцам Сталінскай Канстытуцыі. Усе мы аднадушна галасуем за совецкую ўладу, уладу рабочых і сялян у Заходняй Беларусі.

Прысутныя на мітынгу апладыруюць і гэтым выказваюць сваё жаданне далучыцца да маналітнай брацкай сям'і совецкага народа.

Усхвалёвана гаворыць рабочы тав. Беляеў:

— У нас павінна быць толькі совецкая ўлада, — заяўляе ён. Аб гэтым дваццаць год марылі працоўныя падняволенай, прыгнечанай Заходняй Беларусі.

Мы досыць нагараваліся за гэтыя 20 год. Вынеслі многа пакут і здзекаў ад польскіх паноў, крывасмокаў-капіталістаў. Турмамі і нагайкамі нас прымушалі лізаць ногі польскай шляхты. Хопіць! Гэтым чорным часам нацыянальнага гнёту і жудаснай эксплаатацыі не бываць больш у Заходняй Беларусі!

Абяздоленыя і забітыя ў мінулым, а зараз свабодныя працоўныя Заходняй Беларусі будуць галасаваць толькі за Совецкую Ўладу. Такі наказ будзе дан выбраннікам на Народнае Сабранне. Мы за хутчэйшае з'яднанне з Совецкай Соцыялістычнай Беларусіяй, з СССР!

Апладысментамі сустракае зал гэтыя словы. Раздаюцца воклічы ў чэсць Чырвонай Арміі, Совецкага Ўрада, вялікага таварыша Сталіна.

Пад бурныя апладысменты мітынг прыняў рэзалюцыю.

З рэзалюцыі мітынга калектыва рабочых і служачых гарадской электрастанцыі

Мы, рабочыя і служачыя гарадской электрастанцыі, абгаварыўшы на сваім мітынгу зварот Часовага Ўпраўлення гор. Беластока да ўсіх часовых упраўленняў гарадоў Заходняй Беларусі з прапановай склікаць Народнае Сабранне для рашэння аснаўных пытанняў дзяржаўнага ўстройства, цалком і поўнасцю падтрымліваем гэту прапанову.

Непераможная Рабоча-Сялянская Чырвоная Армія з чэсцю і доблесцю выканала сваю вялікую гістарычную місію і вызваліла Заходнюю Беларусь ад векавога гнёту польскіх паноў, памешчыкаў і капіталістаў.

Канула ў вечнасць праклятае, паднявольнае, рабскае жыццё працоўнага чалавека пад ботам польскай шляхты. Не бываць больш нацыянальнаму і соцыяльнаму гнёту. Для нас настала радаснае свабоднае жыццё, калі кожны працоўны любой нацыянальнасці стаў родным братам.

Мы вітаем і поўнасцю адабраем прапанову аб скліканні Народнага Сабрання. Прадстаўнікі народа свабоднай Заходняй Беларусі на гэтым сабранні будуць рашаць аб дзяржаўным устройстве. Мы выражаем поўную ўпэўненасць у тым, што адзіным правільным рашэннем Народнага Сабрання будзе — з'яднанне Заходняй Беларусі з Совецкай Соцыялістычнай Беларусіяй, з сям'ёй народаў вялікага Совецкага Саюза.

Для ўсіх працоўных Заходняй Беларусі няма і не можа быць большай радасці, чым жыць і працаваць пад сонцам Сталінскай Канстытуцыі, тварыць ва імя свабоднага народа краіны соцыялізма.

Вялікай гордасцю для ўсіх нас будзе знамянальны дзень, калі мы станем грамадзянамі самай магутнейшай ў свеце краіны — СССР. Мы рады і шчаслівы, што станем раўнапраўнымі грамадзянамі СССР, што наша жыццё і работу будзе ахоўваць гераічная Чырвоная Армія.

Калектыў рабочых і служачых гарадской электрастанцыі выражае поўную ўпэўненасць у тым, што на тэрыторыі Заходняй Беларусі будзе ўстаноўлена Народным Сабраннем совецкая ўлада, адзіная ўлада рабочых і сялян.

Няхай жыве свабодная Заходняя Беларусь!

Няхай жыве Совецкая Ўлада ў Заходняй Беларусі!

Няхай жыве СССР і яго Чырвоная Армія — наша вызваліцельніца!

Няхай жыве родны наш бацька, правадыр і настаўнік вялікі таварыш Сталін!

ПАСТАНОВА
Часовага Упраўлення гор. Вільно

Абмеркаваўшы зварот Часовага Упраўлення гор. Беластока да ўсіх Часовых Упраўленняў гарадоў Заходняй Беларусі, Часовае Упраўленне гор. Вільно цалкам і поўнасцю адабрае прапанову і ініцыятыву аб скліканні Народнага Сабрання для вырашэння дзелавых пытанняў дзяржаўнага ўстройства Заходняй Беларусі.

Для працоўных Заходняй Беларусі наступіла пара вырашыць пытанне аб стварэнні новага дзяржаўнага ўстройства, сазданні ўлады, якая-б цалкам служыла інтарэсам народа і была-б уладай народа, уладай працоўных.

Народнае Сабранне Заходняй Беларусі вызначыць характар будучай улады, вырашыць пытанне аб уваходжанні абласцей Заходняй Беларусі ў склад Беларускай Совецкай Соцыялістычнай Рэспублікі і тым самым — у склад СССР.

Часовае Упраўленне гор. Вільно заклікае ўсіх рабочых, сялян і інтэлігенцыю падтрымаць прапанову аб скліканні Народнага Сабрання і аказаць яму поўную і актыўную падтрымку ў вырашэнні стаячых перад ім пытанняў.

У Камітэт па арганізацыі выбараў дэпутатаў Народнага Сабрання Часовае Упраўленне гор. Вільно дэлегіруе сваіх прадстаўнікоў тт.:

Узіна П. І.
Путрамента Ю. В.
Клепачко А. Н.

Старшыня Часовага Упраўлення г. Вільно
Я. А. Жылянін

6-га кастрычніка 1939 года
гор. Вільно

Дзень выбараў у Народнае Сабранне павінен стаць днём вялікага свята яднання працоўных Заходняй Беларусі вакол пабеданоснага сцяга Леніна — Сталіна

Далучымся да адзінакроўных братоў нашых
(на мітынгу ў вёсцы Яшуны)

20 год сяляне вёскі Яшуны цярпелі гнёт і праізвол польскіх паноў. Польская шляхта проста прыгнятала сялян, пазбавіла іх роднай беларускай мовы. Уся лепшая зямля, належыла памешчыку. За дазвол пасвіць на панскай зямлі жывёлу, збіраць у лесе дровы, прыходзілася плаціць памешчыку вялікія грошы.

Прыход Чырвонай Арміі, для працоўных вёскі Яшуны, як і для ўсіх працоўных Заходняй Беларусі, з'явіўся вялікай радасцю.

Учора ў вёсцы адбыўся мітынг, на якім сяляне абмеркавалі зварот Часовага Ўпраўлення горада Беластока.

Пасля зачытання зварота з кароткімі прамовамі, поўнымі любві і адданасці к Саюзу Совецкіх Соцыялістычных Рэспублік, Совецкаму народу, Рабоча-Сялянскай Чырвонай Арміі і таварышу Сталіну, выступілі сяляне. Усе выступаўшыя выражалі сваё жаданне ўстанавіць на тэрыторыі Заходняй Беларусі Совецкую Уладу і далучыць Заходнюю Беларусь к Беларускай Совецкай Соцыялістычнай Рэспубліцы.

— 20 год, — гаворыць селянін Раўба, — працоўныя Заходняй Беларусі гнулі спіны перад польскімі памешчыкамі і капіталістамі. Рабоча-Сялянская Чырвоная Армія дапамагла нам прагнаць польскую шляхту. Зараз мы самі будзем вырашаць свой лёс, мы ўсе, як адзін, стаім і будзем стаяць за стварэнне ўлады, якая-б служыла інтарэсам народа. Такой можа быць толькі Совецкая Улада.

Выступіўшы на мітынгу тав. Адамовіч расказаў, як былы памешчык жорстка прыгнятаў сялян, як над імі здзекваліся.

— Толькі за тое, — кажа ён, — што я, як вартаўнік, не затрымаў селяніна, які збіраў у памешчыцкім лесе галлё, памешчык пасадзіў мяне на 2 гады ў турму. Зараз Чырвоная Армія вызваліла працоўных ад гнёту польскіх паноў і капіталістаў. Мы атрымалі магчымасць разам з усім Совецкім народам, з працоўнымі Совецкай Беларусі будаваць радаснае і шчаслівае жыццё.

Актыўны ўдзел у мітынгу прынялі і жанчыны. Батрачка Ермаловіч С. у сваім выступленні сказала:

— Прышоў канец панскаму гнёту і праізволу. Над намі ўзышло Сталінскае Сонца, якое асвяціла нам шлях к шчасліваму і радаснаму жыццю. Дзякуй роднаму Сталіну за бацькаўскія клопаты аб прыгнечаных Заходняй Беларусі.

Беднячка т. Механоўская расказала, як цяжка жылося жанчынам пры памешчыках і капіталістах.

— Нашы дзеці, сказала яна, — раслі непісьменнымі, школ на беларускай мове не было. Наагул, каб вучыць дзяцей, патрэбны былі сродкі, а іх у батракоў і беднякоў не было. Прыходзілася малых дзяцей пасылаць працаваць на памешчыка. Мы з вялікай радасцю будзем галасаваць за далучэнне да адзінакроўных братоў па класу — Беларускай Совецкай Соцыялістычнай Рэспублікі і будзем разам з імі будаваць радаснае жыццё.

Мітынг закончыўся воклічамі ў чэсць таварыша Сталіна і доблеснай Чырвонай Арміі, якая вызваліла працоўных Заходняй Беларусі ад іга фашызма.

Пад мудрым кіраўніцтвам Комуністычнай Партыі, народы Совецкага Саюза пабудавалі соцыялістычнае грамадства, пад гэтым-жа кіраўніцтвам народы Заходняй Беларусі пайдуць да лучазарнай светлай будучыні.

Няхай жыве Усесаюзная Комуністычная партыя большэвікоў!

Заходняя Беларусь павінна стаць Совецкай

Завадскі гудок апавясціў аб сканчэнні рабочага дня. Рабочыя і інтэлігенцыя Цэнтральнага лесазавода ідуць у вызначанае месца на рабочы сход, каб абмеркаваць зварот Часовага Ўпраўлення горада Беластока і рашыць, якую стварыць уладу на вызваленнай ад польскіх паноў і капіталістаў беларускай зямлі.

Сход адкрывае член рабочага камітэта, рабочы Ранцоў. Для зачыткі і растлумачэння зварота т. Ранцоў прадстаўляе слова прадстаўніку Часовага Ўпраўлення таварышу Ягораву.

З выключнай увагай прысутныя слухалі кожнае слова зварота. Яны стараліся запомніць усё, бо там была сказана ўся праўда, сказана, як і ў якіх умовах жыў працоўны народ Заходняй Беларусі.

Бурай апладысментаў і воклікамі „ура“ ў гонар таварыша Сталіна і гераічнай Чырвонай Арміі, сход адабрае ініцыятыву Часовага Ўпраўлення горада Беластока аб скліканні Народнага Сабрання, якое павінна рашыць пытанне аб уваходзе Заходняй Беларусі ў Совецкі Саюз.

— Мы доўга мучыліся, нас зверскі эксплаатавалі польскія паны і капіталісты. Дзякуем Совецкаму Ўраду, — за наша вызваленне. Я буду галасаваць за Ўладу Советаў, бо гэта ўлада ёсць сапраўды народная Ўлада-гаворыць член рабочага камітэта т. Капілевіч.

Маё патрабаванне — усю ўладу перадаць Советам. Заходняя Беларусь павінна быць далучана да Совецкай Беларусі гаворыць рабочы Рабухін. Громам апладысментаў сустрэлі прысутныя словы таварыша Рабухіна.

Слова бярэ бухгалтар завода Яшунскі. Ён расказвае, як жылі рабочыя, як цяжка было працаваць пад гнётам капіталістаў. Але гэтаму прышоў канец. Зараз усе працоўныя атрымалі радаснае, свабоднае жыццё. Я галасую за ўстанаўленне Совецкай Улады на тэрыторыі Заходняй Беларусі і я ўпэўнен, што ўся працоўная інтэлігенцыя горада Вільно разам з працоўным народам, будзе галасаваць за далучэнне Заходняй Беларусі да вялікага Совецкага Саюза.

На сходзе выступілі рабочыя Ранцоў, [illegible] і інш. Усе яны [illegible] Чырвоной Арміі, Совецкаму Ураду, таварышу Сталіну за [illegible] вызваленне.

У сваёй рэзалюцыі пішуць:

„Мы рабочыя і інтэлігенцыя Цэнтральнага лесзавода, патрабуем, каб усю ўладу ў Заходняй Беларусі перадалі Советам. Заходняя Беларусь павінна стаць Совецкай, бо [illegible] ўлада з'яўляецца сапраўды [illegible], яна будзе служыць народу.

Мы просім уключыць Заходнюю Беларусь у склад Беларускай Совецкай Соцыялістычнай Рэспублікі, каб разам са сваімі братамі па крыві і класу будаваць сваё новае жыццё“.

Ф. Сурганаў.

—:::—

Мітынг на кансервным заводзе

Упаковачны цэх кансервнага завода Гінзбурга перапоўнен людзьмі. Скончыўшы работу, рабочыя прышлі сюды на мітынг, каб выказаць свае лепшыя пачуцці і ўдзячнасць за вызваленне. Упершыню, пасля шматгадовага панскага прыгнёта яны свабодна сабіраюцца на свой рабочы сход.

Мітынг, прысвечаны абгаварэнню зварота Часовага Упраўлення гор. Беластока, адкрывае старшыня рабочага камітэта т. Левін. Слова прадастаўляецца палітруку таварышу Макарэнка.

Пасля зачытання зварота, тав. Макарэнка расказаў сабраўшымся аб вялікіх [illegible] поспехах Совецкага Саюза, аб Сталінскай Канстытуцыі, якая дала ўсім працоўным Соцыялістычнай [illegible] правы на працу, адпачынак і асвету.

Вызвалены народ павінен браць уладу ў свае рукі і будаваць шчаслівае жыццё па прыкладу Вялікай Соцыялістычнай дзяржавы. Апошнія словы пакрываюцца бурай апладысментаў і воклічамі: „Няхай жыве свабодная Беларусь!“, „Няхай жыве слаўная Чырвоная Армія!“, „Няхай жыве вялікі правадыр, таварыш Сталін!“.

Пасля даклада разгарнуліся ажыўленыя спрэчкі.

На трыбуне старая работніца Цытрон Марыя:

— Раней мы былі пазбаўлены права гаварыць аб сваіх правах. Жанчына была зусім бяспраўная. Капіталісты распальвалі нацыянальную варожасць, нацкоўвалі яўрэя на паляка, паляка на яўрэя.

Якое шчасце цяпер! Совецкі народ працягнуў нам брацкую руку дапамогі! Адзінай правільнай уладай у нас павінна быць улада рабочых і сялян. Мы горача жадаем далучыцца да Совецкай Беларусі і пад праменнямі Сталінскай Канстытуцыі будаваць шчасліва заможнае жыццё.

Работніца Юрэвіч Браніслава ў сваім выступленні гаворыць:

— Мы бязмежна рады і ад усёй душы дзякуем Чырвонай Арміі, Совецкаму Ураду і таварышу Сталіну за вызваленне ад панскага здзеку і эксплаатацыі. Упершыню мы так свабодна сабраліся на свой рабочы сход. Мы аднадушна падтрымліваем зварот Часовага Упраўлення гор. Беластока. У нас адно жаданне: жыць і працаваць у вялікай сям'і народаў СССР.

У сваёй рэзалюцыі рабочыя кансервнага завода пішуць:

„Мы рабочыя і служачыя адабраем зварот Часовага Упраўлення г. Беластока і выказваем гарачую ўдзячнасць Большэвіцкай партыі і Совецкаму Ураду за вызваленне Заходняй Беларусі ад панскага гнёту, выказваем падзяку таму, хто натхняў і напраўляў Чырвоную Армію на паспяховае выкананне гістарычных задач брацкай дапамогі, — вялікаму Сталіну.

Мы выражаем сваю салідарнасць з прапановай Часовага Ўпраўлення г. Беластока аб уваходжанні Заходняй Беларусі ў склад абласцей Совецкай Беларусі. Мы лічым, што адзінай уладай на тэрыторыі Заходняй Беларусі павінна быць улада Советаў. Мы адабраем мерапрыемствы сялянскіх камітэтаў аб канфіскацыі памешчыцкіх зямель і лічым неабходным нацыяналізаваць банкі і буйныя прадпрыемствы. Гэтыя патрабаванні аднадушна падтрымліваем і будзем энергічна весці барацьбу за правядзенне іх у жыццё“.

Н. Валькевіч.

Прысягаем, што ад заваёванага не адступім ані кроку

Учора адбыўся агульны сход байцоў і камандзіраў 4-га батальёна Рабочай Гвардыі гор. Вільно. Сход абмеркаваў зварот Часовага Упраўлення гор. Беластока да ўсіх Часовых Упраўленняў гарадоў Заходняй Беларусі.

У гарачых, прачуленых прамовах выступаўшыя Рабоча-Гвардзейцы т.т. Котачынскі, Рачыцкі, Крыстафовіч і інш. расказалі сабраўшымся аб праклятым мінулым жыцці, аб здзеках польскіх паноў над рабочымі і сялянамі, выказвалі пачуцці гарачай любві і ўдзячнасці Рабоча-Сялянскай Чырвонай Арміі, Вялікаму Совецкаму Народу, Большэвіцкай Партыі і Вялікаму Сталіну за аслабаненне працоўных Заходняй Беларусі ад панскага гнёта, жабрацтва і бяспраўя.

У аднадушна прынятай рэзалюцыі гаворыцца:

— «Мы байцы і камандзіры 4-га батальёна Рабочай Гвардыі г. Вільно, азнаёміўшыся з зваротам Часовага Ўпраўлення г. Беластока, вітаем ініцыятыву яго аб скліканні Народнага Сабрання Заходняй Беларусі.

Даём клятву, што паднятую да жыцця Беларусь ніхто і ніколі не разаб'е.

Пад кіраўніцтвам ВКП(б) і Правадыра працоўных усяго света таварыша Сталіна моцна-спаянай сям'ёй у Саюзе Совецкіх Соцыялістычных Рэспублік будзем будаваць сваё шчаслівае і радаснае жыццё».

—:::—

Сталінскім шляхам — да з'яднання з соцыялістычнай бацькаўшчынай

Каля 200 рабочых фанернай фабрыкі Рохліна, сабраліся, каб заслухаць і абмеркаваць зварот Часовага Ўпраўлення горада Беластока.

Учарашнія палоннікі польскага фашызма, беспрацоўныя, абяздоленыя і без усялякіх палітычных праў, сёння яны самі вызначаюць свой лёс, самі рашаюць, якую форму дзяржаўнага ўстройства прыняць.

Рабочыя адзінадушна заяўляюць, што яны гатовы будаваць сваё жыццё па-сталінску, на аснове Ленінска-Сталінскай нацыянальнай палітыкі, разам з сям'ёй шчаслівых народаў соцыялістычнай бацькаўшчыны — СССР.

Імя Вялікага Сталіна рабочымі сустракаецца дружнымі апладысментамі.

Выступіўшы на мітынгу, тав. Я. Бонок заявіў:

— На працягу дваццаці год, польскія паны і памешчыкі смакталі рабочую кроў. Яны дваццаць год душылі працоўных Заходняй Беларусі бяз розніцы нацыянальнасцей. Зараз мы — свабодны народ. Мы гаспадары зямлі і лясоў.

З вялікім энтузіязмам рабочыя прынялі рэзалюцыю, у якой запісалі:

— Мы не хочам больш улады капіталістаў, бо гэта голад, галеча, беспрацоўе. Мы хочам мець новую ўладу, уладу пры якой жывецца шчасліва, радасна і весела. Такой уладай з'яўляецца ўлада Совецкая.

—:::—

Аддамо свае галасы за Совецкую Уладу!

Учора на табачнай фабрыцы горада Вільно адбыўся многалюдны мітынг.

Рабочыя і работніцы фабрыкі заслухалі і абгаварылі зварот Часовага Ўпраўлення г. Беластока да ўсіх Часовых Упраўленняў гарадоў Заходняй Беларусі.

Прадстаўнік Часовага Ўпраўлення г. Вільно таварыш Басалыга зачытвае зварот.

Пачынаецца абмеркаванне зварота. Першае слова бярэ таварыш Антонаў:

— 19 верасня доблесная Чырвоная Армія раз і назаўсёды вызваліла нас ад памешчыцкай кабалы. Мы ўсе дваццаць год — гаворыць ён — думалі аб такім жыцці, — жыцці, дзе людзі жывуць і развіваюцца свабодна, радасна і шчасліва, мы жадаем жыць і гадавацца разам у брацкай сям'і народаў Совецкага Саюза, разам з таварышом Сталіным.

— Сёння для нас вялікае свята, — гаворыць рабочы таварыш Бейнаровіч, — мы прышлі сюды сказаць сваё слова, што мы, рабочыя табачнай фабрыкі горада Вільно, жадаем стварыць новае дзяржаўнае ўстройства, якое-б цалкам і поўнасцю служыла інтарэсам працоўных. Такой уладай з'явіцца ўлада совецкая. Мы, рабочыя павінны ў час выбараў дэпутатаў, аддаць свае галасы за таго, хто вызваліў нас, рабочых і сялян ад панскай няволі, стварыў новае, светлае жыццё. Мы павінны галасаваць за Комуністычную партыю большэвікоў, за совецкую ўладу, за вялікага, усімі любімага Іосіфа Вісарыёнавіча Сталіна.

З гарачай прамовай выступіў стары рабочы тав. Параханковіч Нікіфар.

— Доўгія годы мы стагналі пад панскім гнётам, — гаворыць таварыш Параханковіч, — нас дваццаць год не лічылі за людзей. Мы ніколі не мелі сталай работы, над намі здзекаваліся польскія крывапіўцы, як хацелі.

Чырвоная Армія абараніла наша жыццё. Мы атрымалі цяпер магчымасць жыць свабодна, мірна і шчасліва.

Пасля выступленняў, пад бурныя апладысменты і воклічы „Ура, Вялікаму Сталіну!“ — рабочыя аднадушна прынялі рэзалюцыю, у якой адобрылі зварот Часовага Ўпраўлення горада Беластока і выказалі сваё жаданне хутчэй далучыцца да Совецкай Беларусі

—:::—

РЭЗАЛЮЦЫЯ
рабочых і служачых табачнай фабрыкі г. Вільно

Рашэнне Совецкага Ўрада—працягнуць брацкую руку дапамогі народам Заходняй Беларусі і Заходняй Украіны, якія доўгія годы стагналі пад цяжкім панскім ігам, выклікала ўсеагульнае лікаванне ў гарадах, сёлах і мястэчках Заходняй Беларусі.

Доблесная, непераможная Рабоча-Сялянская Чырвоная Армія прынесла нам доўгачаканае вызваленне ад памешчыцка-капіталістычнай кабалы і эксплаатацыі.

Самым гарачым нашым жаданнем, зараз, з'яўляецца жаданне — злучыцца ў брацкую сям'ю народаў Вялікага Совецкага Саюза. Мы горача падтрымліваем заклік Часовага Ўпраўлення г. Беластока аб скліканні Народнага Сабрання Заходняй Беларусі для вырашэння пытання аб дзяржаўным устройстве.

Усе свае галасы мы аддамо за таго, хто вызваліў нас ад вечнай кабалы і эксплаатацыі, хто даў нам свабоднае, шчаслівае жыццё — за вялікага, любімага таварыша Сталіна, за Комуністычную партыю большэвікоў, за Совецкую Ўладу.

Няхай жыве Народнае Сабранне Заходняй Беларусі!

Няхай жыве Совецкая Улада!

Няхай жыве Вялікі Саюз Совецкіх Соцыялістычных Рэспублік і яго непераможная Рабоча-Сялянская Чырвоная Армія!

Няхай жыве лепшы друг усіх працоўных усяго Света, Вялікі Сталін!

На мітынгу гандлёва-прамысловых служачых г. Вільно.

Учора, 6 кастрычніка 1939 г., у зале быўшай Кансерваторыі адбыўся мітынг членаў профсаюза гандлёва-прамысловых служачых. Зала была перапоўнена настолькі, што не магла ўмясціць у сабе ўсіх прысутных. Мітынг адкрыў старшыня Саюза прамовай, у якой вітаў Чырвоную Армію і дзякаваў ёй за дапамогу ў вызваленні працоўных Заходняй Беларусі з пад гнёту паноў і памешчыкаў.

Пасля гэтага, слова ўзяў батальённы камісар тав. Аўдзеенка. Ён даў малюнак сучаснага міжнароднага становішча, расказаў аб шчаслівым і радасным жыцці ў краіне Советаў. Прысутныя віталі непераможную Чырвоную Армію і правадыра сусветнага пролетарыята таварыша Сталіна. Словы прамоўцы былі заключаны бурнымі апладысментамі і тысячагалосным спевам „Інтэрнацыянала“. Быў зачытан тэкст зварота Часовага Упраўлення г. Беластока да Часовых Упраўленняў Заходняй Беларусі. З вялікім уздымам быў сустрэты зварот. Прысутныя горача віталі правадыроў Партыі і Урада і выражалі сваё жаданне жыць у брацкай сям'і народаў СССР.

На мітынгу была прынята рэзалюцыя, ў якой служачыя гандлёва-прамысловага профсаюза г. Вільно горача вітаюць зварот Беластокскага Часовага Упраўлення аб скліканні Народнага Сабрання для вырашэння пытання, аб далучэнні Заходняй Беларусі да Совецкага Саюза.

Ю. Гальберштадт.

Адказны рэдактар І. М. ОФЕНГЕЙМ.

Згублены пашпарт і даведка аб аслабаненні ад ваеннай службы на імя Мараўскага Казіміра — лічыць НЕСАПРАЎДНЫМІ.

Згублены дакуманты:

1) пасведчанне Бакштанскай валасці, Валожынскага пав. аб асабовасці

і 2) вайсковая кніжка былых польскіх уладаў

на імя

Мікалая Осіпавіча ШЫЛЫ, лічыць несапраўднымі.

10 кастрычніка ў 16 гадзін па мясцоваму часу склікаецца

СХОД

членаў прафесіянальнага саюза

землямераў і меліяратараў

Сход адбудзецца ў памяшканні б. Землеўпарадчага ўпраўлення, В. Пагулянка 24.

Часовы Камітэт

Адрас рэдакцыі і друкарні: вул. Епіскопа Бандурскага 4. Тэл. 79 і 99.